# Голас Радзімы

ШТОТЫДНЁВАЯ ГАЗЕТА
БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»

№ 17 (2211) 25 красавіка 1991 г. Выдаецца з 1955 г.

Цана 8 кап.




Чаму Беларусі бог даў такі лёс! За час, які адмераны аднаму пакаленню, мы столькі перажылі! Здаецца, што нашаму цярпліваму і шматпакутнаму народу наканаваны вечны, неаціхаючы боль. Боль Курапатаў, якія забралі сотні тысяч жыццяў. Боль Хатыні, спаленай вайной, у якой не стала кожнага чацвёртага з нас. Цяпер — боль Чарнобыля... Ніхто з пэўнасцю не скажа, наколькі паменее наша нацыя і хто народзіцца праз пакаленне, два, тры. І што стане з нашай мілай, прыгожай зямлёй, з нашай Бацькаўшчынай; ужо сёння значная частка яе тэрыторыі знявечана радыяцыяй, на ёй не можа жыць чалавек. Да комінаў Хатыні дадаліся коміны Чарнобыля...

Гэта было 26 красавіка 1986 года — чарнобыльская катастрофа. Цяжкі крыж выпрабаванняў нашага народа...

Валянціна АКОЛАВА

## ПЕ-РА-СЯ-ЛЕН-ЦЫ

*мінская паэма*

### 1. УСТУП

— Дачарнобыль... і паслячарнобыль:
Ружа дзікая, з чорным шыпом...
Боль як сталь найвысокае пробы,
Як расшчэплены гром,
З чорным невад-крылом над стагоддзем.
(Не закрэсліць. І морам не змыць)...
Мы наіўныя, што хутка пройдзе,
Ён, як чэрнь-адчарніць, —
Кажа Федар Іванавіч...
— Людцы,

Мы прыехалі ў Мінск "нехачмі"...
Край палескі — у атамнай будцы.
Дзень — хрышчоны слязьмі...
Вось чаму не шкадобы (жальбіны!)
Я прашу ў гараджан (паляшук), —
А вясковае маці-гардыні:
думак-працы для рук...

### 2. ЧАРНОБЫЛЬСКІЯ БЕЛАРУСЫ

... Яны ніколі горад не палюбяць —
З ягонай чаркі: радасць, боль, прыгубяць...
Не захмялеюць ад жыцця ў сталіцы,
Зімой накормяць галубоў, сініцаў...

Палескі дыялект не згубяць — раптам,
Народныя не знішчаць песні, жарты...
На восем частак сэрца не разрубяць, —
Яны ніколі горад не палюбяць.

Да скроняў веку мудрасць прыгалубяць...

### 3. УСПАМІНЫ ГАННЫ АНДРЭЕЎНЫ ПРА 26 КРАСАВІКА 1986-га ГОДА

Той дзень пасхальным быў, падмогай святу...
На зелень мяты
Раса пярсцёнкі раніцы скідала:
Вясну гукала.
Дарогай той да хрэсніцы хадзіла —
І ўнучка Дзіму
Лячыла ад гадзючынага ўкусу...
Род беларусаў
Народных лекаў не забыў тайніцы.
І бліскавіцу —
З клубамі дыму ўгледзела (і-у-д-у!)...
Пакуль жыць буду —
Страшней не ўгледзяць вочанькі нічога...
Вось тое ўчора!
— Шкадаваных не ўшкадаваць, нябога...
Мы ўсе — ад бога!

### 4. НЕПІСЬМЁНЫ З ПРАКЛЯТАЕ ЗОНЫ

З дому — пісьмы, а гэтым — няма.
Не напіша змярцвелая зона:

(Заканчэнне на 7-й стар.).

«МІНСКІ КІРМАШ. ВЯСНА-91»

## ЦІ НЕ ПАЧАТАК ПЕРАМЕН?

Летапісная хроніка далёкіх часоў данесла да нас скупыя звесткі аб першых кірмашах у Мінску. Пачатак яны бяруць яшчэ з XV стагоддзя. Купцы, землеўладальнікі з многіх рэгіёнаў Расіі, з-за мяжы прывозілі ў Мінск тканіны, сельскагаспадарчую прадукцыю, вырабы народных умельцаў, жывёлу на продаж, абмен ці аўкцыён.

Хронікі больш позніх стагоддзяў падкрэслівалі, што стаць удзельнікам кірмашоў было вельмі складана: не хапала месца і для пражывання на заезных дварах, і для тавару ў гандлёвых радах. А яшчэ за гэта патрабавалася плаціць вялікія грошы. Ці не таму найбольш заможныя купцы "зафрахтоўвалі" розныя там корчмы за месяц ці два да кірмашоў.

Час уносіў свае карэктывы. Кірмашы ў Мінску праіснавалі да Кастрычніка. І, фактычна, адрадзіліся ў наш час. Цяпер яны праводзяцца два разы ў год: вясной і летам. Апошні з іх прайшоў сёлета ў сярэдзіне красавіка.

У кірмашы прынялі ўдзел каля 900 прадпрыемстваў і арганізацый Беларусі, іншых рэспублік, а таксама 15 фірм з-за мяжы. Бадай што, такой колькасці ўдзельнікаў, стэндаў, экспанатаў у будынку "Мінскэкспа" на праспекце Машэрава яшчэ ніколі не было. Хаця далёка не кожнае прадпрыемства ці фірма змаглі паказаць сваю прадукцыю, як кажуць, ва ўсім бляску. Многія прыехалі ў Мінск нібыта на разведку — толькі з праспектамі, тэхналагічнай дакументацыяй, іншыя не змаглі атрымаць дастатковую плошчу для размяшчэння ўсіх экспанатаў (выстаўляцца каштуе вельмі дорага!), а трэція змаглі і шыкануць.

**НА ЗДЫМКУ: у зале выстаўкі. Экспануюцца замежныя аўтамабілі.**

**(Заканчэнне фотарэпартажу змешчана на стар. 3).**



СУСТРЭЧЫ Ў ПАРЫЖЫ

## ПРАЕКТ "ЮНЕСКА — ЧАРНОБЫЛЬ"

У Парыжы адбылася сустрэча міністра замежных спраў БССР Пятра Краўчанкі з генеральным дырэктарам ЮНЕСКА Федэрыка Маерам. Абмеркаваны комплекс пытанняў, звязаных з рэалізацыяй праекта "ЮНЕСКА — Чарнобыль", які ўступіў у дзеянне ў выніку падпісання 9 студзеня гэтага года спецыяльнага пагаднення паміж ЮНЕСКА, СССР, БССР і УССР.

Напярэдадні пятай гадавіны чарнобыльскай трагедыі ў штаб-кватэры ЮНЕСКА з удзелам міністра замежных спраў БССР адбылася прэзентацыя фільма "Воблакі нашага дзяцінства", прысвечанага акцыі міжнароднай салідарнасці з дзецьмі Чарнобыля. Дзякуючы гэтай акцыі 1235 беларускіх дзяцей змаглі адпачыць летам 1990 года ў пятнаццаці краінах Заходняй Еўропы.

У прэзентацыі прынялі ўдзел кіраўнікі пастаянных прадстаўніцтваў буйнейшых краін свету пры ЮНЕСКА, паслы рада дзяржаў, акрэдытаваныя ў Парыжы. П. Краўчанка, які выступіў перад прысутнымі, ад імя парламента, урада і народа Беларусі выказаў сардэчную падзяку ўрадам усіх краін, а таксама раду міжурадавых арганізацый, рэлігійных канфесій, Сусветнай арганізацыі руху скаўтаў за праяўленыя салідарнасць і гуманізм. З пачуццём глыбокага задавальнення было адзначана, што ў гэтым годзе дзяцей з Беларусі гатовы прыняць на аздараўленне ўжо 20 краін свету.

ПАМЯЦЬ АБ ПРОДКАХ

## РАДАЎНІЦА

Здаўна ў гэты дзень прынята ў народзе аддаваць даніну памяці і павагі продкам, памінаць памерлых блізкіх і сяброў. Таму ў аўторак, 16 красавіка, па ўсёй Беларусі адзначалася Радаўніца. У многіх раёнах, на асобных прадпрыемствах гэты дзень быў нерабочым — яго перанеслі на суботу. А людзі спяшаліся на могілкі.

Упершыню Радаўніца адзначалася і на афіцыйным узроўні. Кіраўнікі Вярхоўнага Савета, урада і Кампартыі рэспублікі, прадстаўнікі гарадскіх улад наведалі мінскія могілкі. Да магіл салдат, загінуўшых пры вызваленні беларускай сталіцы, воінаў-інтэрнацыяналістаў, вядомых партыйных і дзяржаўных дзеячаў мінулага ляглі букеты кветак. У Курапатах мінутай маўчання была ўшанавана памяць ахвяр сталінскіх рэпрэсій.

ДЗЯРЖАВА І РЭЛІГІЯ

## НАЗНАЧАНЫ ВАТЫКАНАМ

Папа Іаан Павел II назначыў шэсць епіскапаў і апостальскіх адміністратараў у Расіі, Беларусі і Казахстане. Гэтыя назначэнні — першы крок да фармальнага стварэння епархіі Рымска-каталіцкай царквы там, дзе будуць працаваць новапрызначаныя.

Архіепіскапам у Маскве назначаны 45-гадовы Тадэвуш Кандрусевіч, епіскап з Гродна, які да гэтага апекаваў паству ў Беларусі. Апошні апостальскі адміністратар Маскоўскай епархіі каталіцкай царквы пакінуў Маскву ў 1936 годзе. Кіраваць будучай епархіяй Мінска і Магілёва будзе 77-гадовы эстонец Казімеж Свёнтэк, епіскапам Гродна становіцца Аляксандр Лашкевіч. К. Свёнтэк таксама будзе апостальскім адміністратарам епархіі ў Пінску. Папа заснаваў таксама каталіцкую адміністрацыю ў Новасібірску. Ёю будзе кіраваць народжаны ў Германіі езуіт Жозеф Верт. Каталіцкім адміністратарам у Казахстан накіроўваецца Ян Ленга (да гэтага часу быў пробашчам у Краснаармейску).

Як мяркуюць, савецкае кіраўніцтва дало згоду на стварэнне епархій у сувязі з тым, што ў 1992 годзе чакаецца візіт Іаана Паўла II у Савецкі Саюз.

*"Прэтэнзіі Савецкага Саюза на Клайпеду маюць такую ж "прававую аснову", як і перадваенная гітлераўскай Германіі на Аўстрыю ці чэшскія Судэты. Клайпеда была суверэннай часткай Літоўскай рэспублікі да вясны 1939 года і ніколі не належала Расіі. Аналагічна, з юрыдычнага пункту гледжання, ідуць справы з Вільнюскім краем. У 1939 годзе і пазней Савецкі Саюз перадаў Літве толькі частку таго, што сам прызнаў за Літвой у дагаворы 1920 года. Акрамя таго, заява кіраўніцтва Савецкага Саюза аб нібыта спрэчнасці нейкіх сённяшніх тэрыторый Літвы павінна быць расцэнена ў свеце як небяспечны сігнал да перагляду граніц. Гэтага СССР, як краіна, што падпісала Заключны акт Хельсінкскай нарады, не павінен дапускаць, а тым больш не ўблытваць Беларусь — члена ААН, якая мае адпаведныя абавязацельствы.*

*Калі ж нейкія пытанні, што тычацца тэрыторыі Літвы, могуць узнікнуць, то выключна з Германіяй і Польшчай. Савецкі Саюз, з прававога пункту гледжання, тут зусім ні пры чым, а памянёныя дзяржавы лічаць свае межы канчатковымі".*

*(В. ЛАНДСБЕРГІС,*
*Старшыня Вярхоўнага*
*Савета Літвы).*

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

● У некаторых вёсках Чавускага раёна на Магілёўшчыне было праведзена апытанне сярод сялян: "Ці хочаце вы ўзяць зямлю?". Усе дружна адмовіліся, спасылаючыся на нестабільнасць палітыкі, немагчымасць купіць сельгастэхніку, нізкія закупачныя цэны на прадукцыю.

● Тэкстыльшчыкам Гродзенскага прадзільна-нітачнага камбіната перастала падабацца назва іх прадпрыемства — "Імя XXV з'езда КПСС". Аб'яўлены конкурс на новую назву камбіната. Пераможца атрымае... аж 100 рублёў.

● На Брэстчыне за пачатку года на 2 працэнты скараціўся грамадскі статак кароў, на 5 — свіней, на 27 — авечак, на 20,9 тысячы галоў зменшылася колькасць птушкі. Адпаведна змяншаюцца пастаўкі мяса і малака дзяржаве.

● Перасоўную медыцынскую лабараторыю ў мікрааўтобусе для дыягностыкі СНІДа (AIDS) перадаў веруючым Гродзеншчыны папа рымскі Іаан Павел II. Цырымонія перадачы дару адбылася ў Гродне на плошчы перад касцёлам.

МЯСА З... ПАВЕТРА





На Калінкавіцкім мясакамбінаце Гомельскай вобласці прыбаўку да 10 тон мяса ў месяц атрымліваюць, як гаворыцца, "з паветра". Гэта стала магчымым дзякуючы прымяненню новай тэхналогіі замарожвання. Яна распрацавана і ўкаранёна дырэктарам прадпрыемства Антонам Горбачам сумесна з вучонымі Кішынёўскага політэхнічнага інстытута.

Сутнасць наватарства ў тым, што на прадпрыемстве традыцыйнае двухфазнае замарожванне замянілі на аднафазную сістэму паветраразмеркавання з унутрыкамернай рэгенерацыяй вільгаці. Натуральны працэнт усушкі мяса, замарожанага такім чынам, значна зніжаецца, якасць жа прадукту застаецца выдатнай. Спецыялісты падлічылі, што калі б усе камбінаты рэспублікі прымянілі такую тэхналогію, Беларусь мела б дадаткова каля 20 тысяч тон мяса ў год. А гэта ні многа, ні мала — гадавая прадукцыйнасць пяці буйных жывёлагадоўчых комплексаў.

НА ЗДЫМКАХ: прыемна паабедаць у сталовай камбіната; расфасаваная такім чынам прадукцыя прадпрыемства карыстаецца добрым попытам. На пярэднім плане — апаратар Зінаіда КУЦЭНКА.

АКТУАЛЬНЫ КАМЕНТАРЫЙ

## НАМ ПАГРАЖАЕ ГОЛАД?

Цяпер ужо ўсім ясна, што памеры і глыбіня палітычнага і эканамічнага крызісу, які напаткаў краіну, настолькі вялікія, што размова ідзе літаральна аб існаванні Савецкага Саюза як дзяржавы. Асабліва востра і хваравіта ўсімі адчуваецца дэфіцыт прадуктаў харчавання. Магазіны пустыя ў прамым сэнсе слова. Любы тавар раскупляецца неадкладна і ў самы кароткі тэрмін. У свабодным продажы ў многіх гарадах няма нават солі.

Пра голад, аднак, гаварыць яшчэ рана, але нарыхтоўка асноўных прадуктаў харчавання год ад года зніжаецца сістэматычна і няўхільна. Так, з 1985 па 1990 год закупкі збожжа скараціліся на 5,7 мільёна тон, хаця мінулы год быў рэкордным па ўраджайнасці. У 1989 годзе збожжа дзяржавай было закуплена на 14,4 мільёна тон менш чым у 1985-м. Закупкі бульбы ў 1990 годзе скараціліся на 7,1 мільёна тон у параўнанні з 1985 годам. Амаль на чатыры мільёны тон менш было нарыхтавана гародніны. Зменшыліся таксама закупкі пладоў і ягад.

Першай прычынай наступаючага харчовага крызісу з'яўляецца, на думку многіх, захаванне калгасна-саўгаснай сістэмы землекарыстання. Крайне абагуленая, а дакладней, дзяржаўная, сельская гаспадарка магла яшчэ так-сяк функцыяніраваць пры каманда-адміністрацыйным кіраванні, калі штогод дзесяткі мільёнаў гараджан па загаду адпраўляліся ў калгасы і саўгасы для выканання тэрміновых сезонных работ. Затраты адносіліся не на сельскагаспадарчую прадукцыю, а на кошт тых прадпрыемстваў і арганізацый, дзе гэтыя людзі працавалі пастаянна.

Вырашэнне праблемы многім бачылася ў паскоранай прыватызацыі сельскай гаспадаркі, надзяленні сялян зямлёй, стварэнні фермерскіх гаспадарак і г. д. Аднак саюзны ўрад у чарговы, і ўжо незлічоны раз пайшоў на выратаванне эканамічна і сацыяльна слабых калгасаў і саўгасаў шляхам павышэння, у які ўжо раз, закупачных цэн на прадукцыю сельскай гаспадаркі і спісанне даўгоў. На гэта пайшло каля 100 мільёнаў рублёў. У цэлым за мінулы год калгасы і саўгасы павялічылі свае даходы ў паўтара раза. Праўда, урад пры гэтым чакаў, што істотна павялічыцца і продаж збожжа, гародніны, мяса і г. д. Але адбылося адваротнае. Скараціліся не толькі аб'ёмы продажу, але і, у цэлым шэрагу выпадкаў, зменшылася вытворчасць. Неабгрунтаванае павышэнне цэн заўсёды суправаджаецца падзеннем вытворчасці — гэты эканамічны закон аказаўся навіной толькі для ўрада.

Прагноз на 1991 год яшчэ больш бязрадасны. Па-першае, мінулой восенню на 4 мільёнах гектараў не былі пасеяны азімыя збожжавыя. Мяркуецца, што гэтай вясной на іх будуць пасеяны яравыя культуры. Але іх ураджайнасць на трэць ніжэйшая. Па-другое, пры росце аб'ёму веснавых палявых работ на 25 працэнтаў (акрамя сяўбы яравых запатрабуецца яшчэ на 7-8 мільёнах гектараў перасяваць з-за неспрыяльных умоў надвор'я) у сельскай гаспадарцы ў гэтым годзе назапашана менш дызельнага паліва, бензіну, тэхнікі і г. д. І, самае важнае, у калгасаў і саўгасаў не хапае насеннага матэрыялу на ўсе наяўныя плошчы.

Пачаў даваць збоі і раней бездакорны спосаб вырашэння харчовай праблемы — імпарт прадуктаў харчавання. За апошнія чатыры гады на знешнім рынку было закуплена 129 мільёнаў тон збожжа, 3,2 мільёна тон мяса і мясапрадуктаў, 2,7 мільёна тон алею, 19,3 мільёна тон цукру і г. д. Але калі раней доларавай выручкі ад экспарту нафты і газу на гэта хапала, то цяпер сітуацыя рэзка змянілася. Расшырылася кола тавараў, якія трэба ўвозіць у краіну. У мінулым годзе, напрыклад, у Германіі і Польшчы быў куплены 1 мільён тон бульбы, якая ніколі раней не ўвозілася. У вялікай колькасці сталі імпартавацца гародніна і фрукты. А экспарт энерганосьбітаў у той жа час істотна скараціўся, і цэны на іх знізіліся. Валютнай выручкі ад продажу нафты і газу аказалася мала, каб пакрыць расходы па імпарту прадуктаў харчавання.

Па планах урада ў гэтым годзе меркавалася закупіць за мяжой 40 мільёнаў тон збожжа, больш за мільён тон мяса і мясапрадуктаў, прыкладна столькі ж алею, каля 5 мільёнаў тон цукру, значную колькасць чаю, кавы, какава-бабоў, цытрусавых і г. д. На жаль, пакуль гэта толькі планы. Ва ўрада па-ранейшаму няма валюты, і, хутчэй за ўсё, паступленні ад імпарту сёлета будуць увогуле намнога меншыя, чым у любым з апошніх 15—20 гадоў.

Скарачэнне запасаў збожжа выкліча і зніжэнне прадукцыйнасці жывёлагадоўлі. Ужо цяпер рэзка скарацілася вытворчасць яек, куранят-бройлераў, пагалоўе птушкі. Пад пагрозай і іншыя галіны жывёлагадоўлі.

Харчовае становішча з кожным днём набывае ўсё больш драматычны характар. Пагроза, калі не голаду, то недаядання становіцца рэальнай. На жаль, урад краіны захоўвае зайздросны спакой, хаця, несумненна, ведае сапраўднае становішча спраў. Прэм'ер Паўлаў заявіў нядаўна, што Кабінет мае намер прыняць "рашучыя меры". На самай жа справе аказалася, што размова ідзе зноў аб масіраванай падтрымцы калгасаў і саўгасаў за кошт прыватных гаспадарак.

Рэальна пазбегнуць недаядання і голаду ў прамым сэнсе можна цяпер, толькі зрабіўшы самыя адчайныя крокі. Адзін з іх — раздача невялікіх участкаў зямлі (ад 0,04 да 0,15 гектара) гараджанам для вырошчвання ўжо гэтай вясной бульбы і іншай гародніны. Б. Ельцын і І. Сілаеў ужо зрабілі гэты крок, дазволіўшы раздачу зямлі. У больш аддаленай перспектыве вырашэнне харчовай праблемы ўсё-такі непасрэдна звязана з поўнай адмовай ад догм аб "перавагах грамадскай гаспадаркі" і размеркаваннем (раздачай) зямлі фермерам.

**Анатоль ДЗЯРАБІН,**
**доктар эканамічных навук, загадчык сектара Інстытута эканомікі АН СССР.**

# ВЕРШНІКІ НА КОНЯХ

Сяргей КАРОЛЬ

**За даль чатырох стагоддзяў адышло ад нас ужо Вялікае княства Літоўскае. Тэрмін, здавалася б, больш чым дастатковы, каб вывучыць, аднавіць, апісаць падрабязна, адкуль яно "ёсць пайшло", як развівалася, чым было, чым стала і чым скончылася. Гісторыяграфія ВКЛ сапраўды багатая, але гісторыя ВКЛ па-ранейшаму хавае ў сабе мноства пытанняў без ясных ці вельмі супярэчлівых, нават узаемавыключаючых адказаў. І справа тут не толькі ў тым, што працэс пазнання не ведае межаў, справа яшчэ ў палітызацыі гістарычнага мінулага тымі ці іншымі сіламі. Змяняліся рэжымы — змяняліся трактоўкі.**

**Сёння далёкая гісторыя ВКЛ стала адной з найбольш актуальных тэм для беларускіх гісторыкаў і найбольш цікавай, прыцягальнай для беларускіх чытачоў. Гэта не дзіва: ідзе вызваленне гісторыі ад магутнага налёту сталінісцкіх стэрэатыпаў, скажэнняў, ілжы, актыўна абуджаецца нацыянальная самасвядомасць беларусаў, якія жадаюць ведаць свае гістарычныя карані, вытокі беларускай дзяржаўнасці. Гісторыя ВКЛ у гэтых адносінах дае шырокую прастору для даследаванняў. Безумоўна, адказы зноў жа неадназначныя, спрэчка працягваецца. І гэта нармальна. Важна толькі, каб яна была вольнай ад палітычнай кан'юнктуры, каб даследаванне вялося з пазіцый аб'ектыўнасці.**

**Вызваленая галоснасцю з кайданаў афіцыёзу, тэма ВКЛ стала прыцягальнай нарэшце для маладых гісторыкаў. Іх пункту погляду, іх меркаванням, магчыма, не заўсёды хапае грунтоўнасці, але затое ў свежасці поглядаў, падыходаў да тэмы, у захапленні сваёй гісторыяй ім не адмовіш. Аб гэтым сведчыць і артыкул Сяргея КАРАЛЯ, студэнта трэцяга курса гістфака Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Аўтар звярнуўся да XIV стагоддзя, якое абышлі сваёй увагай даследчыкі. Ён убачыў у падзеях таго часу завязку многіх працэсаў, якія вызначаць у будучыні лёс ВКЛ, лёс беларускай дзяржаўнасці.**

Суадносіны ўлады і народа, улады і дзяржаўнай сістэмы, дзяржаўнай палітыкі прыцягвалі ўвагу гісторыкаў усіх часоў. І тым мацней прыцягальная сіла існаваўшай некалі дзяржавы, калі размова вядзецца аб нацыянальным у яе нараджэнні і развіцці, тым больш інтрыгуе ўлада, калі яна ўзнікла на мяжы эпох, на мяжы культур, на мяжы этнасаў. Вялікае княства Літоўскае ў гэтых адносінах — ідэальны аб'ект для даследаванняў. Яго дзяржаўнае збудаванне, сістэма яго ўлады — своеасаблівыя і парадаксальныя. Дзяржаўнасць якога народа пранесла яно праз сваю гісторыю? — пытанне для спрэчак, што не сціхаюць і сёння.

Да апошніх дзён аргументацыю шукалі ў XIII, XV і XVI стагоддзях, чамусьці абыходзячы XIV. А між тым менавіта яно, гэтае ваеннае стагоддзе, — час стварэння той формы ўлады, якая з'явілася такой непадобнай на вядомыя нам. Гэта час, калі сціскаліся спружыны, якія, распусціўшыся стагоддзем пазней, прапанавалі свету і гісторыкам незвычайную краіну — краіну, дзе развіваліся побач некалькі народаў, суіснавалі некалькі вер. Тады і з'явіўся вобраз дзяржавы, што жыла асаблівым і часам незразумелым палітычным жыццём: яна не стала ні манархіяй, ні дэмакратыяй, не была унітарнай, аднак і федэратыўнай завершанасці так і не набыла. І (у гэтым была яе драма) сышла з палітычнай карты разам са сваёю назваю. Гэта была трагедыя для людзей тых часоў. А для нас пытанні: таму што сёння, гледзячы на сучасныя заходнееўрапейскія краіны і назіраючы іх гістарычны шлях, мы бачым іх непасрэднымі спадкаемцамі свайго сярэднявечча. І ў нас апускаюцца рукі, бо не пакідае пачуццё "абдзеленасці" ўласным мінулым. Але варта крыху напружыць зрок, адкінуўшы школьныя стэрэатыпы, і перад намі паўстане сапраўды арыгінальная гісторыя беларускага народа...

XIV стагоддзе было надта важным для тагачаснай Белай Русі — аднаго з прататыпаў зборнага вобраза ВКЛ, не менш важнае яно і для Беларусі цяперашняй — адной з яго пераемніц. Гэта стагоддзе працягвае задаваць нам пытанні, і трохколерны сцяг над вежай Гедыміна ў Вільні — толькі палова адказу на іх, другую палову трэба яшчэ шукаць. Бо ўлада літоўскіх князёў не азначае выключна літоўскую дзяржаўнасць. Бо ВКЛ — таксама дзяржаўнасць і беларуская. І мабыць менавіта XIV стагоддзе больш за ўсё сведчыць на карысць гэтага.

## БРЫГАНДЫ Ў КНЯЖАЦКІМ АДЗЕННІ

Вялікі князь Гедымін, "правіцель літоўцаў і рускіх", загінуў у пахмурны восеньскі дзень у Прусіі ля аднаго з крапасных муроў Беербурга. Вялікі князь, улада якога фактычна абмяжоўвалася правам военачальніка, кіраўніка паходаў і абароны, і загінуў як воін: ад кавалка металу, што трапіў у грудзі, выпушчанага з яшчэ невядомага на ўсход ад Прусіі ружжа. Ён падзяліў лёс мноства іншых вояў, якія штурмавалі вал і не ведалі, што ў байніцах звычайнай сцяны, у руках звычайнага кнехта сядзіць маленькі д'ябал, злы дух, здольны змярцвіць дзесятак чалавек усяго за некалькі імгненняў. Гэта было нечакана і страшна, і войска, адкаціўшыся ад муроў, абцяжаранае смуткам княжацкага абозу, вярнулася ў Вільню.

Стары горад, але яшчэ маладая сталіца, сустрэў правіцеля жалобнымі абрадамі трох вер. Праз дзень па даўняму паганскаму звычаю цела Гедыміна спапяліла полымя пахавальнага вогнішча. Сем яго сыноў, сем мужных вояраў з абветранымі ў паходах тварамі, моўчкі праводзілі князя. Надыходзіў час выконваць апошнюю бацькаву волю — раз'язджацца па замках, што вызначыў ён кожнаму з сыноў. Пабудаваныя да яго смерці, суадносна з яго ваеннымі ідэямі, гэтыя замкі чакалі сыноў вялікага воя. І ехалі яны туды не ўладарыць, а толькі кіраваць, выконваць у кожнай вобласці тыя ж функцыі, што выконваў і іх бацька на вялікім княжэнні. Альгерд накіроўваўся ў цэнтр былых Нальшанаў Крэва, Кейстут — у Трокі. Малодшы і, па паданню, любімы сын Гедыміна Яўнут мусіў заставацца ў Вільні.

Няма неабходнасці распавядаць пра астатніх, таму што менавіта гэтыя тры ў хуткім часе зробяцца галоўнымі героямі вялікіх падзей, у той час як іх чатыры неназваныя браты застануцца крыху збоч.

І нікога, у тым ліку саміх княжатаў, такое размеркаванне не здзівіла. Як не здзівіла і тое, што дзяржава заставалася амаль што без вярхоўнай улады. Не здзівіла, бо традыцый яе захавання не існавала. Не было традыцый спадчыннасці велікакняжацкага трона, як не было і самога трона, як не было і ўласнага замка — трывалага і адвечнага дому ўладара, а былі сядло і конь, дзіда, меч і кальчуга, валы і вежы ажно дзевяці замкавых збудаванняў, размеркаваных цяпер па сынах. Не было і ўласнага дамена, няхай маленькага, але ж свайго астраўка ў моры чужых сапраўды прыватных зямель. Хаця б такога, як Іль-дэ-Франс (літаральны пераклад — востраў Францыі) вядомых Капетынгаў ці такога, як вотчына Івана Каліты, князя Маскоўскага. Ваяўнічы і шалёна смелы, на выгляд такі ўладарны і ганарлівы, вялікі князь літоўскі, Міндоўг ці Войшалк, Віцень ці Гедымін, свайго дамена не меў.

Старажытныя літоўцы, брыганды Усходняй Еўропы, яшчэ з XIII стагоддзя ваявалі ва ўсіх частках паўночна-ўсходняй яе паловы. Часта ім даводзілася пакідаць і дом свой, звыкацца з готыкай тэўтонскіх замкаў, мяняючы затым іх на навагрудскую гару, як Міндоўг, ці на белыя вежы Пскова, што прытулілі Даўмонта. Старажытныя літоўцы, якія жылі на вялікіх лясістых абшарах, нават не акрэсленых тады выразнай граніцай, не мелі феадальнага права, не атрымалі і ўласна літоўскага караля, як не атрымалі і чыста славянскага князя сумежныя з этнічнай Літвой славянскія вобласці.

У выніку на палітычнай сцэне з'явіўся герой, якога цяжка падвесці пад хрэстаматыйныя клішэ. Гэта быў літоўскі вараг — Віцень, што стаў ваенным выканаўцам Навагрудка, а з 1307 года і Полацка, адкуль дапамог выставіць немцаў, а затым Гедымін — "правіцель літоўцаў і рускіх", князь, які прадстаўляў ваенную палітыку ўжо добрай паловы Усходняй Еўропы.

Адсутнасць велікакняжацкага дамена адбілася і на тытулатуры. Напрыклад, поўны тытул Гедыміна, у адрозненне ад тагачасных заходніх і маскоўскіх традыцый, не ўключаў у сябе спіс вотчын са старажытным даменам наперадзе, а пісаўся проста — "ласкаю Боскай літоўскі і рускі правіцель, правіцель і князь Земгаліі".

Тое, што князь займаўся вайной і знешняй палітыкай (на тыя часы амаль заўжды адно і тое ж), было тыповым для ўсёй феадальнай Еўропы. Звычайным было і тое, што ўнутраная палітыка, у першую чаргу, вядзенне гаспадаркі, знаходзілася ў кампетэнцыі мясцовых уладароў—феадалаў (не блытаць іх з вялікімі князямі і княжатамі). Адметным было тое, што вярхоўная ўлада грунтавалася не на ўладанні зямлёй, якая ў Заходняй Еўропе была пачаткам эканамічных, сацыяльных і палітычных правоў, сацыяльнага статуса чалавека. І хаця феадальнае грамадства ведае шмат розных варыянтаў развіцця, асноўны ход і вынік усіх былі універсальнымі — моцны зямельны надзел даваў магчымасць будучаму манарху распаўсюджваць уладу тэрытарыяльна, а затым давесці аўтарытэт свайго двара з палітычнага да сацыяльнага — надаць уладзе грамадзянскі статус.

На Захадзе ўлада распасціралася з замка, які велічна ўздымаў да нябёсаў свой высокі і востры шпіль, у ВКЛ — сам замак будаваўся толькі дзеля таго, каб дапамагчы ўладзе выканаць галоўную яе функцыю — функцыю ваеннай абароны. Дзевяць замкаў, Ліда ці Крэва, Трокі ці Вільня, нізкія, нібы прыціснутыя да зямлі, больш змрочныя, чым велічныя, да сённяшніх дзён нагадваюць аб галоўных стратэгічных накірунках тагачаснай вайны.

Гэтым можна растлумачыць і тое, што сталіца ВКЛ адвольна пераносілася з Навагрудка ў Трокі і пазней у Вільню з адпаведнасцю стратэгічнай і практычнай выгадзе. Вядома, гэта немагчыма пры цэнтралізаваным усталяванні ўлады праз уплыў каралеўскага феода, сталіца якога і ператвараецца ў сталіцу дзяржавы.

Такім чынам, узнікала ўлада, што мела больш ваенна-палітычны, чым прававы характар. Пры шырокім жа мясцовым кіраванні яна была, фактычна, наднацыянальнай. Ваенна-палітычная ўлада караля і феадальная мясцовая (палітычная, судовая і гаспадарчая) ўлада не знайшлі агульнай дзяржаўнай формы з тым ці іншым этнасам. Нашчадкі Скаламенда (Гедымінавічы), што ўвасаблялі дзяржаву XIV стагоддзя, валодаючы, як здавалася, усёю тэрыторыяй, практычна не валодалі нічым. Нейкі час дзяржаўная цэнтральная ўлада — літоўская па паходжанню галоўных яе трымальнікаў — і беларускія, а пазней і ўкраінскія землі, са сваімі сталымі адносінамі і традыцыямі, існавалі нібыта паралельна. Вядома, што яны не былі ізаляваны, наадварот, у распараджэнні князя былі войска, харчаванне і яго вытворцы, тыя ж самыя замкі, крэпасці, табуны коней, але гэта ўсё давалася князю для паспяховага выканання ім задач абароны ці было ўзнагародай за цяжкую службу.

Так у XIV стагоддзі ў ВКЛ усталявалася велікакняжацкая ўлада, што не мела пад сабою дамена і феодаў — васалаў, прычэпленых да яго, г. зн. не мела ў самым дакладным сэнсе феадальнай базы і была ад самага пачатку ўладай грамадзянскай, хаця пакуль яшчэ неправавой. У гэтым яе асаблівасць, якая ўпрыгожвае сабою гісторыю ўсяго сярэдневяковага свету і безумоўна, робіць Беларусі вялікі гонар, бо менавіта традыцыі кіравання на беларускіх землях і зрабілі яе такой.

То быў час свабоды для беларускіх (і іншых, што складалі ВКЛ) зямель. Яшчэ не было ўціску сквапнага двара цэнтралізаванай дзяржавы, яшчэ не галіліся на іх магнаты, яшчэ панавала свабода канфесій, мацнела культура, вёўся вольны гандаль. Адным словам, тады закладвалася ўсё тое, што вытрымала націск сацыяльных штормаў канца XIV — пачатку XV стагоддзяў, усё тое, што і зрабіла век XVI "залатым".

Сістэма, якая склалася, была настолькі простай і зручнай, што большасць суседніх з ВКЛ зямель, прайшоўшы ўжо вялікі гістарычны шлях, дасягнулі высокага ўзроўню цывілізацыі, па-рознаму, але пераважна добраахвотна ўступалі свае ваенныя справы кампетэнцыі вялікага літоўскага князя. На агромністай цяпер ужо тэрыторыі ВКЛ па-ранейшаму панаваў меч, і смелыя сыны Гедыміна не знаходзілі часу, каб схаваць яго ў ножны.

Любарт быў заручаны з валынскаю княжною Лукер'яй. Альгерд — з віцебскай Марыяй, Кейстута прызналі на Падляшшы і Берасцейшчыне, і велікакняжацкая ўлада стала, па выразу У. Пічэты, набыткам княжацкай сям'і. Тое, што было раней справай аднаго, цяпер стала справай моцнага клана, зносіны паміж членамі якога не рэгуляваліся нічым, акрамя відавочнай патрэбы дапамагаць адзін аднаму і падначальвацца бацьку ці найбольш аўтарытэтнаму ў родзе. Смерць Гедыміна нічога не змяніла, наадварот, такая патрыярхальная сістэма ўлады захавалася яшчэ надоўга.

І сапраўды, яна выглядала моцнай і надзейнай. Ні варункі ўнутранага жыцця, ні знешняя небяспека, здавалася, не давалі падстаў каб змяніць яе. І ўсё ж вялікія ўзрушэнні ўжо набліжаліся.

Апыніся тады наш сучаснік у Вялікім княстве Літоўскім, ён зрабіў бы высноў, што васьмідзесяцігадовы гістарычны эксперымент пацярпеў правал. Што агульная, хаця і не надта глыбокая, але ўсё ж вярхоўная ўлада, якая прыкрывала сваім шчытом тры этнасы, спыніла сваё існаванне. І гэта своеасаблівае дзяржаўнае ўтварэнне сышло з усходнееўрапейскай сцэны, што велізарная тэрыторыя вяртаецца да XIII стагоддзя, калі не было і размовы не толькі аб славянска-літоўскім блоку, але нават уласна славянскае аб'яднанне выглядала далёкай будучыняй. Ды кожны новы крок гісторыі — заўсёды адзін з магчымых. Асабліва ў пераломныя яе моманты. Гэта — час альтэрнатыў. Але нашы продкі не ведалі слова альтэрнатыва, яны звычайна спасылаліся на лёс, які і з'явіўся ў хуткім часе ў вобразе чорнага крыжа на белай мантыі, паказаўшы слабасць сістэмы раскладвання ўлады па абласных утварэннях.

**(Заканчэнне будзе).**

*ПІШУЦЬ ЗЕМЛЯКІ*

# ХАЧУ ПАДТРЫМАЦЬ ГАЗЕТУ

Паважаная рэдакцыя!

Сардэчна вітаю вас і жадаю вам ад Бога добрага здароўя, усякае памыснасьці ва ўсебаковым вашым жыцьці.

Найперш шчыра дзякую вам за навагодняе павіншаваньне і змяшчэньне майго ліста ў газеце. Хачу вас спавесьціць аб нашай асьветніцкай працы для беларускага народа праз радыё і літаратуру. Пры гэтым пасылаю вам копію нашага часопісіка, якога нашае Беларускае Брацтва выдае ў рускім часопісе "С. І". Спадзяюся, што вы калі-небудзь чулі нашу радыёпраграму "Добрая вестка" з Монтэ-Карла, яна гучыць па панядзелках у 18.45 па маскоўскаму часу.

Мы, замежнікі, вельмі цешымся з таго, што вы газетай "Голас Радзімы" далучаецеся да распаўсюджваньня Боскае праўды: друкаваньнем кніжкі "Боская і людская мудрасць", агалошэньнямі аб хрысьціянскіх вечарынах і другіх хрысьціянскіх дзеях, за што Богу і вам сардэчна дзякуем.

Пры гэтым пасылаю вам маю аплату за газету ў амерыканскай валюце, але прызнаюся, што не ведаю, ці правільна гэта раблю.

Пры заканчэньні даводжу да вашага ведама, што калі будзе на тое воля Божая, дык у надыходзячае лета намерваемся з сынам наведаць Радзіму і ў тым ліку Мінск. Калі пажадаеце, наведаем рэдакцыю, дзе бліжэй пазнаёмімся адны з другімі.

Застаюся з пашанай чытач вашай газеты

Я. РАПЕЦКІ,

Канада.

# Sobre la procedencia de los bielorrusos

Algunos científicos bielorrusos —G. Shtíjov, N. Yermalóvich y otros— ponen en duda en sus estudios no sólo la existencia de la población rusa antigua sino también la conocida tesis de que la Rus de Kíev habría sido la cuna común para tres pueblos eslavos orientales: el ruso, el ucranio y el bielorruso. Naturalmente que no carece de lógica polemizar sobre el grado en que se ha consolidado la población rusa antigua, y caracterizar este proceso etnohistórico como finalizado o no, mas no hay fundamentos para pasar por alto el hecho de que en la Rus de Kíev existía la comunidad eslavo-oriental con su base política, su unidad confesional, su similitud cultural y lingüística y su actividad económica. Todo eso funcionaba en el seno de la sociedad feudal.

Es sabido que las primeras señales del nacimiento de un pueblo determinado se hacen visibles en el período de transición de la comunidad primitiva a la sociedad feudal. Para los eslavos orientales (más tarde los pueblos ruso, ucranio y bielorruso) estos procesos surgieron en vísperas de la formación de la Rus de Kíev, que en los siglos VIII y IX unía en un solo Estado las agrupaciones triables de polianos, severianes, drevlianes, volynios, dregóvichis, radímichis, krívichis, viátichis, eslovenos y otros. En esta época la organización tribal de los eslavos orientales fue sustituida por la territorial debido a la aparición de principados de tipo feudal.

En los siglos VII y VIII, el territorio de Bielorrusia contemporánea fue poblado por tribus de eslavos orientales: krívichis, dregóvichis, radímichis y en parte en el sur por severianes y volynios (buzhanes y dulebos). Abarcaba la cuenca del alto Dniéper, del Dvina Occidental, Sozh, Prípiat, Nieman y en parte, el Bug Occidental. El principado de Pólotsk era el más espacioso, pues se formó en el territorio de Bielorrusia a base de los antiguos krívichis (polochanes), que habitaban a las orillas del Dniéper y el Dvina, y los dregóvichis nórdicos.

El desarrollo de las relaciones feudales en la Rus de Kíev y el crecimiento del número de ciudades estuvo acompañado por el surgimiento y fortalecimiento de muchos principados feudales en el territorio de Bielorrusia: Túrovsky, Pinsky, Beresteysky, Novogrudsky y otros. En los siglos XI y XII se produce el desmembramiento del principado de Pólotsk. En su territorio se forman los principados de Vitebsk, Minsk, Orsha, Zaslavl y otros principados feudales.

A la población de todas las tierras de Rus de Kíev se les llamaba rusos, rusines, rúsichis (del nombre Rus, la Rus de Kíev). Después de la cristianización de Rusia en el siglo X, este término étnico quedó establecido. La población ortodoxa de la Rus de Kíev se consideraba gente de fe rusa, lo que llevó a la coincidencia de la conciencia étnica y confesional en las tierras del Estado de Rus antigua. La conciencia de su pertenencia étnica crecía merced a unos factores tan importantes como la comunidad de los fundamentales componentes de la cultura, la lengua, y, hasta cierto punto, de la vida económica de los eslavos orientales.

Así pues la comunidad étnica de los eslavos orientales se formó en la Rus de Kíev.

Como resultado de la división feudal aparecieron fuerzas centrífugas que debilitaron el poderío del antiguo Estado ruso, el que no supo resistir la invasión tártaro-mongola. Su parte occidental se juntó en la segunda mitad del siglo XIII al territorio del Gran Principado de Lituania.

Después de la desintegración de la comunidad étnica de la Rus antigua se produjo la formación de tres pueblos independientes: el ruso, el bielorruso y el ucranio, los que se formaron sobre la base de diferentes partes del antiguo Estado ruso, desde finales del siglo XIII en un proceso que se prolongó hasta el siglo XVI.

Las tierras de los eslavos orientales que fueron integradas en el gran Principado de Lituania se encontraban en un relativo alto nivel económico y cultural. Este factor desempeñó un papel positivo en la formación de la nación bielorrusa, así como en la del idioma estatal del principado. Es menester citar otros factores que a finales de los siglos XIII-XVI contribuyeron a la formación de la nación bielorrusa con sus peculiaridades específicas en la vida económica y social, cultura material y espiritual, autoconciencia, lengua y tradiciones: en el territorio del Gran Principado de Lituania los bielorrusos se poblaron de una forma compacta, los mercados locales se unieron paulatinamente; la autoconciencia, el idioma, la cultura, pertenencia confesional se hicieron comunes. El desarrollo tanto de las particularidades étnicas como de la cultura de la nación bielorrusa tuvo como base las tradiciones de la nación de la Rus antigua (su parte occidental), así como la influencia étnica, social y confesional del Gran principado de Lituania y, más tarde, del Rzeszpospolita (Polonia).

En los tiempos cuando las tierras bielorrusas entraban en el territorio del principado, surgen nuevos nombres de algunas partes, principalmente, derivados como antes del nombre "Rus". Así pues, las provincias de Vítebsk y la parte nororiental de Moguiliov, empezaron a llamarse Rusia Blanca, gran parte de la provincia de Grodno y la parte occidental de Minsk se llamaba Rusia Negra en las fuentes históricas, y al sur, la llanura forestal y pantanosa recibió el nombre de Poliesie, cuya etimología está clara. En cuanto a los términos "Rusia Blanca" (Bielorrusia) y "Rusia Negra" hay distintas explicaciones en diferentes fuentes, debido al estatuto político y religioso de dichas tierras. La Rusia Blanca es libre, independiente y avanzada. Los mismos nombres poseían las partes de Rusia que no dependían tanto de los tártaros (la Horda de Oro), como es el caso de las provincias de Rostov y Súzdal, Kíev, Moscú, Smolensk y algunas otras partes de Rusia de los siglos XIII al XV. En relación con Bielorrusia su denominación se hizo común entre los siglos XV y XVIII, y se consolida a partir de la segunda mitad del siglo XVIII y hasta principios del siglo XX. El término "Rusia Negra" había surgido más temprano (en el siglo XIV) y se refería a las tierras que ya en el siglo XIII estaban bajo la dependencia del Gran Principado de Lituania. La parte nororiental de Bielorrusia libre —menos dependiente de los príncipes lituanos— fue llamada Bielorrusia en contraposición de Rusia Negra.

Algunos científicos consideran que la Rusia Blanca correspondería a las tierras donde primero llegó el cristianismo y que las otras tierras habrían recibido el nombre de Rusia Negra porque quedaban paganas.

Así pues, el término "Rusia Blanca" fue traído del exterior, pero en el siglo XIX y principios del XX se extendió paulatinamente por todo el territorio de los bielorrusos.

**Vasili BONDARCHIK, miembro correspondiente de la Academia de Ciencias de la RSSB, y jefe del sector de entnografía del Instituto de Arte, Etnografía y Folclore**



*Los alumnos de la escuela № 103 y los de Portland (EE.UU.) van manteniendo buenos contactos. Hace poco alumnos norteamericanos fueron huéspedes de sus coetáneos de Minsk y durante dos semanas, viviendo en sus hogares, en el seno de familias bielorrusas, conocían la ciudad, tradiciones históricas y culturales de la capital de Bielorrusia. Sin duda alguna los contactos de esta índole ayudan a los escolares a enriquecer sus conocimientos y contraer nuevas amistades.*

*EN LA FOTO: alumnos bielorrusos y norteamericanos hacen un recorrido por la ciudad.*

*Foto: V. TOLOCHKO*

# LA SOLIDARIDAD INTERNACIONAL

**Vladimir SAVCHENKO, Doctor en Ciencias Biológicas y presidente del comité nacional bielorruso del programa de la Unesco "El Hombre y la Biósfera", se refiere a la resonancia que tuvo el desastre de los bielorrusos en la opinión pública mundial.**

Después de unos años de jugar al secreto de Polichinela, nuestro país empezó a discutir abiertamente el problema de Chernóbil. El 3 de julio de 1989 el Comité Bielorruso de Defensa de la Paz, junto con otras organizaciones sociales de Bielorrusia, se dirigió a sus compatriotas y a la gente de buena voluntad de todos los países del mundo llamándoles a prestar ayuda a las personas afectadas por la radiación, en primer término a los niños. Tuvo una respuesta inmediata, pues enseguida comenzó la afluencia de donaciones monetarias, medicinas e instrumental médico.

Nuestra compatriota María Goroj, que vive en Bélgica, pese a que su familia no posee gran fortuna, donó 20 mil francos belgas al Fondo de Chernóbil. Ella tiene planeado realizar una recolecta de medios para ese Fondo entre la población belga.

La firma austriaca de caridad "Folkshilfe" donó a la eparquía de Minsk 36 toneladas de alimentos vitaminizados para los establecimientos infantiles de Bielorrusia. Estos productos han sido dirigidos a los niños de la provincia de Moguiliov (distritos de Slávgorod, Chérikov y Krasnopolie) y de la provincia de Gómel (distritos de Chechersk y Vetka).

Desde varios países están llegando donaciones monetarias. Así pues: los parroquianos de la Iglesia Ortodoxa bielorrusa de santa Eufrosinia de Pólotsk en Londres recogieron 500 mil libras esterlinas para el Fondo; Julia Begutska, Stella y Georgui Shinkar de EE.UU. entregaron 700 dólares a las víctimas del accidente; Elena Grigoróvich y María Semerenko donaron 13 mil francos belgas.

Recientemente, se creó en Estocolmo una organización social "S.O.S. Chernóbil", cuyo objetivo es difundir entre la población sueca información verídica sobre Chernóbil, pedir ayuda para las víctimas del accidente, y que los niños afectados sean acogidos por ese país para proporcionarles atención médica.

En marzo de 1990 los representantes del Comité Bielorruso de Defensa de la Paz se entrevistaron con Mary Brennan, una de los líderes de la "campaña por el desarme nuclear", organización inglesa pro paz. A la huésped británica le interesaban los aspectos médicos de la catástrofe de Chernóbil. A invitación de esta organización social visitó Gran Bretaña V. Soldátov, miembro efectivo de la Academia de Ciencias de Bielorrusia, que dio una conferencia de prensa. Por canales diplomáticos los representantes de la RSS de Bielorrusia solicitaron ayuda a tales organizaciones internacionales como la ONU, la Unesco, UNEP, OIEA, etc.

# «QUEREMOS HACER NUESTRO APORTE»

**Con estas palabras se dirigen con más y más frecuencia al Comité Bielorruso de Defensa de la Paz personas de muchos países, que desean ayudar a la república.**

La organización social antibélica de la RFA "La misa cristiana de la paz" en nombre de su pueblo expresa un arrepentimiento con motivo de las atrocidades, cometidas por los fascistas durante la Segunda Guerra Mundial. Es sabido que durante su ocupación, en el territorio de Bielorrusia pereció una de cada cuatro personas. Por eso a los mensajeros del "Christlicher Friedendienst" les embargan especiales sentimientos cuando arriban al suelo bielorruso. Cuando se supo de la catástrofe en Chernóbil, el "Christlicher Friedensdienst" y los habitantes de la RFA fueron los primeros que acudieron en prestar ayuda concreta.

En el año en curso los huéspedes de la FRA han visitado ya dos veces a los enfermos en el Instituto de Investigación de Medicina Radiológica de Aksákovshchina, en el sector infantil del centro oncológico republicano de Borovliany, en el hospital de la provincia de Gómel, en las clínicas distritales de Braguin y Vetka, y en hospital público de Sávichi. Entregaron a estos establecimientos medicinas, instrumentos médicos, jeringas desechables, aparatos para hacer transfusión de sangre, coches para inválidos, alimentación para niños, juguetes, etc.

Invitados por los amigos alemanes, la orquestra de cámara "Cantábile", que interpreta música antigua, y que está adscrita a la Filarmónica Estatal bielorrusa, realizó una gira de caridad por muchas ciudades de la RFA. Con las divisas ganadas los músicos adquirieron instrumental médico, aparatos y equipos, y todo eso fue entregado al hospital de una de las regiones afectadas por el accidente.

Siguen llegando donaciones y medios al Fondo de Chernóbil. Su volumen dista todavía mucho de poder satisfacer las necesidades, pero su valor moral es incalculable.

**Iván KIRICHENKO, primer vicepresidente del Comité Bielorruso de Defensa de la Paz**

### LA CUOTA DE LOS FUNCIONARIOS DE LA ONU

A iniciativa de la Comisión Social del personal del Departamento Europeo de la ONU en Ginebra, en el Palacio de las Naciones se conmemoró el Día de las Víctimas de Chernóbil.

Miles de funcionarios de la ONU y de otras organizaciones internacionales con sede en Ginebra, y los habitantes de la ciudad tuvieron la oportunidad de conocer los materiales informativos sobre la tragedia, y de entregar sus donaciones al fondo de ayuda a los damnificados.

**Redactor de la página K. SHELESTÓVICH**

*НЕВЯДОМЫЯ ФАКТЫ СМЕРЦІ ПАЭТА-КЛАСІКА*

# ДВАНАЦЦАЦЬ ГАДОЎ ДА ГІБЕЛІ

**Аб новых, дагэтуль невядомых фактах трагічнай смерці Янкі Купалы расказвае пісьменнік-гісторык, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Барыс САЧАНКА, які нядаўна закончыў расследаванне гэтай гісторыі.**

### ХАРАКІРЫ ЯНКІ КУПАЛЫ

— Барыс Іванавіч, адразу ж узнікае пытанне, чаму так доўга цягнула ДПУ са сваім рашэннем — знішчыць паэта — аж з 1930 па 42-гі год. Бо тады, у трыццатыя, у адзін момант, нярэдка без суда і следства, прападалі фігуры куды больш значныя, чым беларускі паэт. Падручныя Ягоды — Яжова — Берыі, як вядома, у выбары сродкаў і прывядзенні прыгавораў у выкананне асабліва не цырымоніліся. А тут спатрэбілася разыгрываць версію няшчаснага выпадку. Навошта гэтыя складанасці ў духу сучаснага дэтэктыва?

Ці няма тут якога-небудзь непаразумення ці жадання цяперашніх даследчыкаў творчасці Купалы саткаць зусім ужо пакутніцкі арэол паэта?

— Так, сапраўды, такія сумненні пры беглым знаёмстве з афіцыйна існуючай версіяй смерці Янкі Купалы ўзнікаюць. Але ў святле новых архіўных фактаў, сведчанняў відавочцаў далёкай ліпеньскай трагедыі, якія мне ўдалося сабраць, гэтыя сумненні блякнуць, адыходзяць на задні план. Па-першае, Янка Купала быў такой каларытнай і неардынарнай асобай, што з самага пачатку зблытаў карты ДПУ, прарваў яго "павуковыя сеткі". І па-другое, хаця ўсе перадваенныя гады ён хадзіў, што называецца, па вастрыі нажа — "пад каўпаком" органаў, паэта, здаецца, ахоўваў сам лёс. Зрэшты, мяркуйце самі.

1930 год. Ва ўсім Савецкім Саюзе раскручваецца махавік рэпрэсій, які набраў поўныя крывавыя абароты к 1937 году. Але ўжо на першых яго вітках звольнены з работы і арыштаваны людзі, якія былі блізкімі знаёмымі і сябрамі Янкі Купалы — акадэмікі У. Ластоўскі, А. Смоліч, С. Некрашэвіч, Я. Лёсік, У. Пічэта, прафесар Б. Эпімах-Шыпіла, пісьменнікі М. Гарэцкі, М. Грамыка, У. Дубоўка, Я. Пушча, У. Жылка, И. Чарнушэвіч, А. Гурло...

Ударыўшы разам па "асінаму гнязду контррэвалюцыянераў і махровых нацыянал-сацыялістаў", у ДПУ паціралі рукі і рыхтавалі адкрыты працэс над удзельнікамі міфічнай контррэвалюцыйнай арганізацыі "Саюз вызвалення Беларусі". Але, нягледзячы на ўсе хітрыкі, працэс адкладваўся з дня на дзень: ніяк не ўдавалася знайсці таго, каму можна было б прыпісаць кіраўніцтва гэтай арганізацыяй. Вось тады, відаць, і ўспомнілі пра Янку Купалу.

Каб запалохаць Купалу, следчыя перакручвалі на свой капыл яго словы, лавілі на недакладнасцях, памылках.

Ідучы ў ДПУ пасля абеду, успамінае жонка паэта Уладзіслава Францаўна, ён вяртаўся адтуль толькі на другі дзень бледны і выціснуты, як лімон.

Не схіліўшы Янку Купалу да нагавораў, ілжывых даносаў, пачалі пагражаць і прыпісваць асабіста яму прыналежнасць да міфічнага "саюза"...

— Але ж былі для гэтага нейкія падставы?

— Не было. Зачэпкай паслужыла публікацыя вершаў з думамі паэта аб народзе, яго суровай долі, пакутлівыя перажыванні перад надыходзячай, як ён па-прарочы заўважыў, "чырвонай паводкай".

І вось, калі дэпэушнікам надакучыла з Купалам цацкацца, яны паставілі яго перад выбарам: ці згаджайся на здраду, ці паедзеш следам за сябрамі — у Сібір.

Загнаны ў кут, ён вярнуўся дамоў, узяў чысты аркуш паперы і напісаў пісьмо старшыні ЦВК СССР і БССР Чарвякову, якое апошнім часам удалося вывудзіць з архіваў.

"Таварыш старшыня!

Яшчэ раз, перад смерцю, заяўляю, што я ні ў якой контррэвалюцыйнай арганізацыі не быў і не збіраўся быць.

... быў толькі паэтам, які думаў пра шчасце Беларусі. Я паміраю за Савецкую Беларусь, а не за нейкую іншую.

... Я вельмі прасіў бы рэабілітаваць мяне перад працоўнымі Савецкай Беларусі.

... Паміраю з цвёрдай верай у вечнае існаванне рэспублікі. Папрасіце ДПУ, каб не цягалі маю жонку. Яна, таксама, як і я, ні ў чым не вінаватая. Сваю бібліятэку перадаю Бел. дзярж. бібліятэцы.

Сардэчна дзякую за ўсё тое добрае, што для мяне зрабілі партыя і Сав. улада.

Паміраю, разумеючы, што лепш смерць фізічная, чым незаслужаная палітычная смерць.

Верагодна, такая доля паэтаў. Павесіўся Ясенін, застрэліўся Маякоўскі, ну і мне туды за імі дарога.

Шкадую толькі, што не змагу больш прымаць удзелу ў вялікім будаўніцтве, якое разгарнулі партыя і Сав. улада ў БССР.

Няхай жа жыве новае творчае жыццё для шчасця ўсяго чалавецтва.

Янка Купала.

Памылкі свае, тыя ці іншыя, я збіраўся выправіць, ды не паспеў.

Я. К."

Скончыўшы гэтае пісьмо, паэт акуратна паклаў яго на стол, дастаў з чахла вялікі паляўнічы нож і ўваткнуў яго глыбока ў жывот...

І калі б не верны сябар Купалы — жонка Уладзіслава Францаўна, так бы і сышоў крывёю няшчасны Янка. Але, нібы прадчуваючы бяду, яна ценем хадзіла за мужам і, пачуўшы здушаны храп у кабінеце, птушкай кінулася на дапамогу. Так вось і выратавала, паспела... Самі ўрачы потым гаварылі: спазніся яшчэ крыху, і ўсё, канец Янку.

### ПОДЫХ ДРУГОЙ СМЕРЦІ

Ну, а як жа зрэагавала кіраўніцтва рэспублікі на спробу вымушанага ўходу паэта з жыцця?

Вось пісьмо тагачаснага першага сакратара ЦК КП(б) Беларусі К. Гея ў Маскву, сакратару ЦК ВКП(б) П. Постышаву:

"Лічу неабходным паведаміць вам, што ўчора, 20 лістапада, зрабіў замах на сваё жыццё Янка Купала — народны паэт Беларусі...

Янка Купала ўваходзіў у кіруючы цэнтр "Саюз вызвалення Беларусі", з'яўляўся ідэйным цэнтрам нац.-дэмаўскай контррэвалюцыі, што знайшло адлюстраванне і ў яго творчасці. Побач з творамі цалкам савецкімі ў яго маюцца вершы і кулацкага, і непасрэдна контррэвалюцыйнага зместу.

Запрошаны для перагавораў у ДПУ, Янка Купала ўпарта адмаўляў сваю прыналежнасць да якой бы там ні было контррэвалюцыйнай арганізацыі і не выявіў нават самага нязначнага жадання пайсці насустрач нам у сэнсе хаця б асуджэння контррэвалюцыйнай дзейнасці сваіх сяброў — удзельнікаў і кіраўнікоў "саюза..."

Усё гэтае здарэнне разглядаецца намі як пратэст супраць нашай палітыкі барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам...

Сам факт замаху на самагубства мы, вядома, не раскрываем".

Але было позна. Сумная вестка пра тое, што Янка Купала зрабіў сабе харакіры з-за праследаванняў ДПУ, імгненна разляцелася па Мінску. Рэха дакацілася да Масквы. Зусім жа нядаўна, летам, у сталіцы ўрачыста адзначалася 25-годдзе літаратурнай дзейнасці песняра.

У Маскве, у камакадэміі, прайшоў творчы вечар паэта, на якім выступіў народны камісар асветы А. Луначарскі, які засведчыў, што "імя Я. Купалы ўпісана ў гісторыю беларускай літаратуры такімі ж вялікімі літарамі, як і імя Тараса Шаўчэнкі ва ўкраінскай літаратуры".

Інтэлігенцыя тады яшчэ не была поўнасцю дэмаралізавана і падарвана крывавымі рэпрэсіямі. Інтэлігенцыя заявіла пратэст.

Выбухнуў скандал. ДПУ давялося тэрмінова замятаць сляды, згортваць справу аб міфічным "Саюзе вызвалення Беларусі". Так Янку Купалу пакінулі ў спакоі.

— Але ці надоўга?

— На жаль, не. Як гэта там Маякоўскі пісаў: "В сто сорок солнц закат пылал, в июль катилось лето..." Сталінскі рэжым ішоў да сваёй вяршыні, да 1937-га. Зноў прыняліся за Янку Купалу. Па адпрацаванай схеме. Спашлюся на ўспаміны тагачаснага першага сакратара ЦК КПБ П. Панамарэнкі, пакінутыя ім пасля XX з'езда партыі.

"... У 1938 годзе я прыехаў у Мінск, а тут... страх, здранцвенне, разгубленасць... Многія пасады не заняты... І кожны дзень, кожную ноч новыя і новыя арышты... Забягае неяк да мяне Берман, ён тады быў кіраўніком НКУС, папку на стол кладзе. "Што гэта?" — пытаюся. "Пагартайце, гэта новыя ворагі народа". Гляджу, у папцы справы на Янку Купалу, Якуба Коласа, якіх я ведаў па творах. "Гэта тэрмінова?" — пытаюся ў Бермана. "Не вельмі, але чым хутчэй, тым лепш. Вораг на волі — гэта заўсёды небяспечна". — "Добра, разбяруся", — гавару.

### ЗАМЕСТ ОРДЭРАЎ — ОРДЭНЫ

...Пачаў думаць, што рабіць. З Масквой, з самім Сталіным трэба звязацца, параіцца? А як? Пасылаць пісьмо — перахопяць. З нарачным пасылаць — тым больш. Па тэлефоне? Не, пра гэта толькі адзін на адзін можна гаварыць. Нарада па прамысловасці якраз намячалася.

... Скончылася нарада, я да Сталіна падышоў. "Іосіф Вісарыёнавіч, хачу з вамі параіцца". — "Што такое?" — пытаецца Сталін. "Чалавек я новы ў Беларусі, да таго ж рускі. А мяне адразу ж пасля прыезду ў нацыянальнае пытанне ўблытваюць". — "Якое нацыянальнае пытанне?" — і вочы ў Сталіна, бачу, загарэліся, заскакалі ў іх агеньчыкі— вялікім знаўцам лічыў сябе Сталін у нацыянальным пытанні. Я і расказаў, як Берман да мяне зайшоў, папку са справамі на Купалу і іншых вядомых у Беларусі пісьменнікаў паклаў, нібыта беларускія пісьменнікі ворагі народа. "А калі яны сапраўды ворагі, дык шкадаваць?" — вымавіў Сталін.

"Ну, думаю, усё", — унутры ў мяне нешта абарвалася: не хацеў я сваю работу ў Беларусі з гэтага пачынаць.

... А Сталін тым часам нешта абдумаў і, нічога не гаворачы, падыходзіць да селектара, націскае кнопку: "У мяне тут у кабінеце малады беларускі сакратар, Панамарэнка. Ён гаворыць, што за ўсе гады Савецкай улады ні адзін беларускі пісьменнік не атрымліваў узнагарод. Гэта праўда? Чую з селектара голас. "Таварыш Панамарэнка зойдзе да вас, аформіце".

Вось так і былі тады заменены ордэры на ордэны..."

І Янка Купала, атрымаўшы ордэн Леніна, выратаваўся другі раз ад лап НКУС. А яго вораг Берман, шэф рэспубліканскага НКУС, тэрмінова быў адкліканы ў Маскву на пасаду намесніка міністра, а затым таксама паспешна расстраляны.

### ЗМОВА "ТАЙНЫХ АГЕНТАЎ"

Пасля гэтага выпадку, на мой погляд, работнікі ўсемагутнага тайнага ведамства затаілі на Янку Купалу злосць і толькі чакалі зручнага моманту, каб назаўсёды з ім расправіцца.

— Ці не памыляецеся вы?

— Думаю, што наўрад ці. У канцы чэрвеня 1942 года Купала з Казані, дзе знаходзіўся ў эвакуацыі, прыехаў па выкліку ў Маскву. Намячалася адзначыць яго 60-годдзе, а таксама сустрэчы ў выдавецтвах, з воінамі і партызанамі, якія адпраўляліся на фронт. Але берыеўцы хадзілі за ім па пятах. Пра гэта, напрыклад, успамінае паэт Анатоль Астрэйка, які амаль не адыходзіў ад Купалы ў тыя апошнія дні. Ён сустрэў іх, якія ўжо прымільгаліся, пры ўваходзе ў гасцініцу "Масква". Трое "асоб" у кепках, выскачыўшы з ліфта, ледзь не збілі яго з ног, так беглі, ратаваліся, каб ніхто не затрымаў.

Другі паэт, Пятро Глебка, абгрунтоўваючы сваю думку пра смерць Купалы як дыверсію, таксама ўказвае на дзве істотныя дэталі. Па-першае, нечаканы і таямнічы выклік Купалы з нумара, дзе ён знаходзіўся, і, падругое, адначасовы замах на жыццё дзеячаў літаратуры і мастацтва, якія гэтак жа, як і Купала, былі незадаволены Сталіным і ўсім тым, што рабілася перад вайной, і ўслых пра гэта не гаварылі.

Версію, што Купалу скінулі, пацвярджаў і Леў Шэйнін, які доўгі час працаваў следчым па асоба важных справах і меў адносіны да высвятлення абставін смерці народнага паэта.

Але даказваць гэтую версію ў 1942 годзе ніхто і не збіраўся. НКУС страшыў усіх. Не дарма ўжо пасля вайны Шэйнін толькі паўтараў: "Купалу дапамаглі памерці".

Неаднаразова гэта пацвярджаў і вядомы беларускі кампазітар Рыгор Шырма, які якраз у тыя дні сядзеў у Маскве на Лубянцы. Пры гэтым ён спасылаўся на следчага, які вёў яго справу. На чарговым допыце, яшчэ да таго, як было афіцыйна паведамлена пра смерць Я. Купалы, следчы з радасцю аб'явіў: "Ну вось, і з вашым апошнім апалагетам-нацыяналістам мы расправіліся". — "З кім гэта?" — са страхам спытаў Шырма. "Ды з Янкам Купалам. Цяпер за вас возьмемся".

Аб тым, што ў пралёт лесвіцы ў гасцініцы "Масква" Янку Купалу скінулі тайныя агенты НКУС, спасылаючыся на пакаёўку, пацвярджае і ленінградскі генетык, доктар навук Зінаіда Абрамава, якая адразу пасля гэтага здарэння аказалася ў гасцініцы "Масква". Ёсць і іншыя пацвярджэнні гвалтоўнай смерці Купалы.

Вось так і закончыўся роўна праз дванаццаць гадоў няроўны паядынак народнага паэта з Дзяржаўным палітычным упраўленнем.

**Аляксандр ШАГУН.**

("Свободные новости").

**ВЫСТАЎКА МАЛАДОГА МАСТАКА**



**У адной з залаў краязнаўчага музея Дзяржынска адкрылася першая персанальная выстаўка маладога мастака мінчаніна Аляксандра Ігнатава. Тут выстаўлена звыш сарака карцін — вынік двухгадовай працы. Любімая тэма мастака — пейзажы роднай Беларусі, іншых мясцін краіны, дзе пабываў Ігнатаў.**

**НА ЗДЫМКАХ: Аляксандр ІГНАТАЎ; карціна мастака "Успаміны пра Кіжы".**

**Фота У. ВІТЧАНКІ.**



### МАЗЫРСКІ СІМФАНІЧНЫ

Мець свой сімфанічны аркестр да нядаўняга часу лічылася прывілеяй сталіцы ды абласных цэнтраў. Гэту непаўнацэнную традыцыю парушылі мазырскія работнікі культуры. Лепшыя музыканты горада аб'ядналіся ў вялікі аркестр, які парадаваў ужо мясцовых знаўцаў класікі першымі канцэртамі. Дзякуючы дапамозе гарадскіх дэпутатаў вырашаны ўсе фінансавыя праблемы, калектыў атрымаў статус прафесіянальнага. У яго саставе — выкладчыкі музычных школ і вучылішча, музыканты з ваеннага аркестра. Амаль усе — былыя выпускнікі Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі. Творчае крэда мазырскага сімфанічнага яго кіраўнік і дырыжор Аляксандр Мазепін вызначыў вельмі лаканічна: змагацца з шэрасцю ў мастацтве, выхоўваць у слухача пачуццё дабра і прыгажосці, запаўняць яго духоўны вакуум.

Дык будзь жа, маэстра Моцарт, добразычлівы да правінцыяльнай сцэны!

**А. ТАРАНДА.**

# Фирма ARRIBA

представляет западные фирмы на польском рынке и наоборот. Является представителем сельскохозяйственного комбината, который имеет свое производство — выращивает зерновые, овощи, фрукты, занимается животноводством — производит их полную переработку на своих предприятиях (компоты, консервы и т. д.). Занимается продажей товаров западных фирм (масла, пива и других), производит строительные работы (внутренняя и внешняя отделка зданий специальными материалами — огнеупорными, противогрибковыми, строит яхты).

Предлагаем сотрудничество всем заинтересованным фирмам и организациям.

Наш адрес: Аллея Стануф Зъедночоных, 53.
04-026 Варшава
Телефон: 13-48-30
Телекс: 816170 MAW PL
Телефакс: 13 48 30.


*ЦІКАВА ВЕДАЦЬ*

# ГЕНЕРАЛ З ВІДЗАЎ

На ўскраіне Відзаў, якія цяпер аказаліся ў развілцы дзвюх вуліц, устаноўлена масіўная, з чорнага мармуру надмагільная пліта, на ёй сціпла значыцца — "Томаш Важдзецкий. 1753—1816".

Але старажылы помняць іншую пліту, чыгунную, знішчаную ў пяцідзесятыя гады, на якой былі пералічаны званні, заслугі выдатнага відзаўца: генерал, сенатар, сябар і паплечнік Касцюшкі.

Томаш Важдзецкі нарадзіўся ў сям'і відзаўскага шляхціца. Адукацыю атрымаў у Вільні, некаторы час жыў і, відаць, працягваў вучобу за мяжой. Аднак амаль да саракагадовага ўзросту Важдзецкі быў вядомы толькі вузкаму колу сяброў. У канцы сакавіка 1794 года, калі ўспыхнула паўстанне пад кіраўніцтвам Касцюшкі, побач з галоўнакамандуючым заззяла імя нікому дагэтуль невядомага правінцыйнага шляхціца Томаша Важдзецкага.

Літаральна за лічаныя дні Важдзецкі збірае і ўзбройвае толькі ў ваколіцах Відзаў атрад у трыста чалавек. Паўстанцы рухаюцца на захад, да іх далучаецца шляхта, сяляне. Армія Важдзецкага хутка павялічваецца да васьмі тысяч і пад яго камандаваннем паспяхова змагаецца з царскімі войскамі пад Брэстам, аваладвае Лібавай, удзельнічае ў абароне Варшавы. За поспехі ўсяго войска і асабістую адвагу камандуючага Касцюшка прысвойвае Важдзецкаму званне генерал-лейтэнанта і, што лічылася асобым адметным знакам, узнагароджвае яго залатым пярсцёнкам з надпісам — "Радзімы сваёй абаронцу".

Апошні месяц паўстання пацвердзіў папулярнасць Важдзецкага, высокую адзнаку яго здольнасцей як военачальніка, яго важную ролю ў паўстанцкім урадзе.

У адным з апошніх баёў з рускімі войскамі — 10-га кастрычніка пад Мацёвіцамі Касцюшка быў цяжка паранены і трапіў у палон. А ўжо праз два дні яго пераемнікам назначаецца генерал Томаш Важдзецкі. Праўда, у званні галоўнакамандуючага Важдзецкі прабыў нядоўга — менш чым праз месяц, 18-га лістапада, ён таксама трапляе ў палон. Як і Касцюшка, Важдзецкі быў адпраўлены ў Пецярбург і пасаджаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць.

Два гады абодва генералы правялі ў зняволенні і былі вызвалены па амністыі новага рускага імператара Паўла І. Паўстанне, якое пачалося некалькімі бліскучымі перамогамі і мэта якога была вызваліць, аднавіць Польшчу і ажыццявіць у ёй дэмакратычныя пераўтварэнні адпаведна з канстытуцыяй 1792 года, падаўлена. Касцюшка выязджае ў Злучаныя Штаты, Важдзецкі вяртаецца ў Відзы, у свой маёнтак, і на доўгія трынаццаць гадоў знікае з палітычнай арэны...

Але не толькі новы надмагільны помнік напамінае ў Відзах (цяпер гарадскім пасёлку на Браслаўшчыне) пра славутага генерала-паўстанца: за пяць кіламетраў ад пасёлка пры дарозе на Ігналіна размешчана сяло Відзы-Лаўчынскія, дзе захавалася сядзіба Томаша Важдзецкага — жылы дом, парк, стары бровар. Ад спіртзавода на сядзібу вядзе прыгожая каштанавая алея. Вось і беласценны дом. Перад ім традыцыйны для старых сядзіб квадратны двор-партэр з зялёнымі лужкамі і клумбамі.

Дом маляўніча размешчаны на спуску да возера, і толькі з азёрнага фасада бачна, што драўляная надбудова стаіць на высокім мураваным цокальным паверсе. Галоўнае ўпрыгажэнне тут — убудаваная ў цэнтр памяшкання арачная галерэя са скляпеністымі праёмамі над ёю. На захад і на поўдзень ад будынка размешчаны пейзажны парк, які займае пяць гектараў. Прамых, абсаджаных ліпамі алей у ім няма, дрэвы — ясені, тапалі, елкі размешчаны курцінамі, гнёздамі, а велічныя стогадовыя дубы і каштаны стаяць пасярод палянак.

Сядзібе Томаша Важдзецкага пашанцавала: адразу пасля заканчэння вайны тут быў дзіцячы дом, а затым мясцовая васьмігадовая школа, гэта значыць памяшканне заўсёды было жылым, рэгулярна рамантавалася. Цяпер настаўнікі хадайнічаюць аб устанаўленні на ім, як на гістарычным помніку і помніку архітэктурна-паркавага дойлідства канца XVIII стагоддзя, ахоўнай дошкі...

Чым займаўся Томаш Важдзецкі, пасяліўшыся ў Відзах-Лаўчынскіх пасля амністыі, пасля вызвалення з казэмата Петрапаўлаўскай крэпасці? Звестак няшмат, аднак вядома, што ён напісаў вялікі том успамінаў аб паўстанні 1794 года ў Вялікім княстве Літоўскім.

Як і Тадэвуш Касцюшка, які адмовіўся прыняць камандаванне "польскімі легіёнамі" і не падтрымаў палітычныя манеўры Напалеона ў Польшчы, не верыў абяцанням французскага імператара і генерал Важдзецкі. Калі войскі Напалеона сталі займаць Віленшчыну, Важдзецкі выехаў у Пецярбург. Пасля разгрому Напалеона на Венскім кангрэсе 1814—1815 гадоў, які нанава падзяліў польскія землі, было створана так званае Каралеўства Польскае ў падпарадкаванні Расіі — польскім каралём лічыўся рускі імператар. Томаш Важдзецкі становіцца членам часовага ўрада ў гэтым каралеўстве (называлася яно яшчэ і Царствам Польскім), займае пасады сенатара, ваяводы, міністра фінансаў.

Памёр Важдзецкі ў 1816 годзе і згодна з завяшчаннем быў пахаваны на радзіме — у Відзах.

Леанід ПРАКОПЧЫК.

# БЕЛАРУСКАЯ КУХНЯ

## ЯЗЫК У ЦЕСЦЕ

Язык прамыць і варыць да гатоўнасці. Затым перакласці яго ў халодную ваду, ачысціць ад скуры і нарэзаць у выглядзе кружочкаў. У муку дадаць соль, яйкі, малако і размяшаць, каб не было камячкоў. У цесце абмакнуць кавалачкі языка і смажыць у фрыцюры.

500 грамаў ялавічнага языка, 0,75 шклянкі мукі, 2 яйкі, 0,5 шклянкі малака, 3 сталовыя лыжкі топленага масла, соль.

## АБАРАНКІ З БУЛЬБЫ

Звараную бульбу працерці, дабавіць яйкі, масла, малако ці смятану, цёрты мускатны арэх і ўсё старанна перамяшаць. З атрыманай масы сфармаваць абаранкі, пасыпаць цёртай булкай і смажыць у фрыцюры. Падаць з зялёнай салатай.

На 10 порцый і кілаграм 500 грамаў бульбы, 2 яйкі, і сталовая лыжка масла, і сталовая лыжка малака ці смятаны, каліва цёртага мускатнага арэха, 5 сталовых лыжак цёртай булкі, і шклянка алею, соль. Каларыйнасць і порцыі 414 кілакалорый.

## СУП БУЛЬБЯНЫ З ГРЫБАМІ, БУРАЧНЫМ БАЦВІННЕМ І АГУРКАМІ

Грыбы памыць і замачыць у цёплай вадзе. Калі яны набрыняюць, варыць у той жа вадзе пад крышкай да мяккасці. Халодную вараную бульбу, бурачнае бацвінне, абабраныя агуркі, цыбулю нарэзаць, дабавіць цёрты хрэн, пасаліць, апусціць у грыбны булён і паварыць. Дабавіць смятану і воцат.

На 8 порцый 0,7 літра вады, 600 грамаў бульбы, 100 грамаў сушаных грыбоў, 100 грамаў бурачнага бацвіння, 3 агуркі, 80 грамаў зялёнай цыбулі, 20 грамаў хрэну, смятана, соль, воцат. Каларыйнасць і порцыі 173 кілакалорыі.

## СВІНІНА, ТУШАНАЯ ПА-БАРЫСАЎСКУ

Невялікія кавалкі свініны пакласці ў гліняны гаршчочак, дабавіць нашаткаваную рэпчатую цыбулю, нарэзаную пустачкамі бульбу, леча, часнок, зеляніва, соль і тушыць у духоўцы.

400 грамаў свініны, 300 грамаў леча, 1 цыбуліна, 1,5 сталовых лыжкі свінога топленага сала, тры долькі часнаку, 8 бульбін, зеляніва, соль.

Больш пяцісот падлеткаў Брэста займаюцца ў клубе юнага марака, што размясціўся на беразе Мухаўца. У далёкім ад мора горадзе вучацца хлапчукі кіраваць ветразямі, спасцігаюць законы навігацыі і суровай марской службы, выхоўваюць у сабе мужчынскі характар. І дапамагаюць ім у гэтым вопытныя мараходы — капітан другога рангу ў адстаўцы Барыс Рыхтэр і былы капітан-рачнік Віктар Пранюк. Яны і сталі ініцыятарамі і арганізатарамі клуба. Па крупінках збіралі марскія рыштунак: плаўбазу, што прышвартавана да прычала, даставілі з Гомеля, дзве шлюпкі "ЯЛ-6" — з Архангельска, марскія карты — з Ленінграда, шасцівёславыя шлюпкі "ЯЛ-П-6" — з Феадосіі, буксір "Цэнтаўр" — з Пінска.

НА ЗДЫМКАХ: у рубцы клубнага цеплахода "Цэнтаўр" шасцікласнік Андрэй КРЭНЬ і В. ПРАНЮК; на рэйдзе. Чарговыя заняткі ў клубе юнага марака.

Фота Р. КАБЯКА.






РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

**НАШ АДРАС:**

МІНСК-5, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Індэкс 63854. Заказ 632.